View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

# Нашы юбіляры

## ГЕНАДЗЬ АПАНАСАВІЧ ЦЫХУН



У кастрычніку 2011 г. беларуская навуковая грамадскасць адзначыла 75-гадовы юбілей буйнога навукоўцы-лінгвіста, доктара філалагічных навук, прафесара Генадзя Апанасавіча Цыхуна, імя якога шырока вядома ў айчынным і замежным навуковым свеце.

Г.А. Цыхун нарадзіўся 30 кастрычніка 1936 г. у вёсцы Кунцаўшчына Гродзенскага раёна ў сям'і настаўніка, а таксама вядомага краязнаўцы і літаратара.

Пасля паспяховага заканчэння сярэдняй школы (1953) Г.А. Цыхун вучыўся ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце па спецыяльнасці «славянскія мовы (балгарская і руская мовы і літаратуры)». Кола яго навуковых інтарэсаў фарміравалася пад уплывам прафесара Ю.С. Маслава, пазней, дзякуючы кантактам з балгарскімі моваведамі, – акадэміка Л. Андрэйчына і прафесара С. Стойкава.

У 1966 г. Г.А. Цыхун абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Сінтаксіс займеннікавых клітык у балгарскай і македонскай літаратурных мовах» (пад кіраўніцтвам Ю.С. Маслава), а ў 1982 г. – доктарскую на тэму «Тыпалагічная праблема балкана-славянскага моўнага арэала». На сённяшні дзень Генадзь Апанасавіч – аўтар больш за 300 фундаментальных навуковых прац па тэорыі моўных саюзаў, па арэальнай лінгвістыцы, балканістыцы, сацыялінгвістыцы, беларускай этымалогіі, гісторыі і бібліяграфіі беларускай мовазнаўчай славістыкі. Ён суаўтар «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы». У працы над гэтым слоўнікам Г.А. Цыхун праявіў свой талент арганізатара, такі неабходны ў калектыве, які працуе над стварэннем слоўніка, калі важна сумяшчаць індывідуальнае і калектыўнае навуковае мысленне.

Удзел у палескіх экспедыцыях 1963–1965 гг. пад кіраўніцтвам М.І. Талстога вызначыў яшчэ адзін напрамак плённай дзейнасці Г.А. Цыхуна – этналінгвістычныя даследаванні. Акрамя таго, сфарміраваны падчас гэтых экспедыцый інтарэс да палескіх гаворак і духоўнай культуры рэгіёна рэалізаваўся далей у працы над стварэннем «Тураўскага слоўніка» – значнай з'явы ў беларускай і ўвогуле ўсходнеславянскай лексікаграфіі, навукова перспектыўнага тыпу слоўнікаў.

Навуковае жыццё Генадзя Апанасавіча Цыхуна звязана ў першую чаргу з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. З 1958 г. ён працаваў у акадэмічным Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа, з 1990 г. быў загадчыкам аддзела славянскага і тэарэтычнага мовазнаўства. З 2005 г. ён – галоўны навуковы супрацоўнік аддзела славістыкі і тэорыі мовы Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.

Беларускі лінгвіст прызнаны ў замежных навуковых колах на самым высокім узроўні. Г.А. Цыхун – акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, акадэмік Македонскай акадэміі навук (з 2004 г.), доктар honoris causa Сафійскага ўніверсітэта (з 2005 г.). У роднай краіне яго заслугі адзначаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1996).

Генадзь Апанасавіч сапраўды запатрабаваны чалавек. Ён – незаменны ўдзельнік разнастайных высокааўтарытэтных камітэтаў і навуковых саветаў: член Прэзідыума Міжнароднага камітэта славістаў (з 2004 г.), намеснік старшыні Беларускага камітэта славістаў (з 1992 г.), член камітэта Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, сустаршыня Таварыства дружбы Беларусь – Балгарыя (з 1992 г.). Г.А. Цыхуна з задавальненнем запрашаюць на высокія навуковыя форумы і заўсёды чакаюць яго выступленняў, якія ўражваюць шырокай эрудыцыяй, аргументаванасцю і маюць вялікую ступень уздзеяння на аўдыторыю.

Г.А. Цыхун актыўна спалучае навуковую працу з выкладчыцкай дзейнасцю. Ён прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства БДУ і ўжо шмат гадоў выкладае на філалагічным факультэце сучасныя балгарскую і македонскую мовы, чытае спецкурсы па тыпалогіі славянскіх моў, арэальнай лінгвістыцы, беларуска-іншамоўнай лексікалогіі і інш. Генадзь Апанасавіч лёгка ўстанаўлівае кантакт са студэнцкай аўдыторыяй. Студэнты-філолагі з энтузіязмам вучацца ў яго генерыраваць новыя навуковыя ідэі, творча пераасэнсоўваць назапашаны ў лінгвістычных даследаваннях тэарэтычны і эмпірычны матэрыял, працуючы пры гэтым згодна з прынцыпамі той навуковай славістычнай школы, традыцыі якой так старанна захоўвае і перадае моладзі Г.А. Цыхун.

Калегі, вучні і сябры віншуюць Генадзя Апанасавіча з юбілеем і шчыра жадаюць яму доўгага і плённага жыцця ў навуцы.

***Кафедра тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства***